# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

’91

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 10 СТУДЗЕНЯ

№ 1 (1665)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

На апошнім пасяджэнні вучонага савета БДУ, якое адбылося напярэдадні Новага года, абмеркавана пытанне аб эфектыўнасці работы аспірантуры і дактарантуры па падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. З дакладам выступіў прарэктар, прафесар А. І. Лесніковіч.

Былі заслуханы таксама прапановы па стварэнню ва універсітэце малых прадпрыемстваў.

* * *

Раней можна было спадзявацца на добрага дзядзю. Неабходны грошы на персанальныя камп'ютэры — прасі і дадуць, няма чым фінансаваць навуковыя даследаванні — дзяржбюджэт дапаможа. Такія бесклапотныя часы прайшлі: зараз трэба самім рупіцца, каб не апусцела ўласная кішэня. Самы на сённяшні дзень распаўсюджаны сярод ВНУ спосаб засцерагчы сябе ад разарэння — плата за падрыхтоўку маладых спецыялістаў. Пакуль пакрываюць расходы заказчыкі і ім гэта абыходзіцца даволі танна — у межах трох тысяч.

За апошнія два гады на рахунак універсітэта ад прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў паступіла 426600 рублёў. Самымі дарагімі нашымі «апекунамі» з'яўляюцца Міністэрства народнай адукацыі, навукова-вытворчыя аб'яднанні «Інтэграл», «Агат».

## ЦІШКОМ

## САБЕ ДАРАЖЭЙ

Афіцыйна адменены сухі закон у інтэрнатах універсітэта для асоб не маладзей за 21 год. Яны, як і ўсе грамадзяне, атрымліваюць талоны на спіртное. Між тым, інтэрнаты спаборнічаюць за атрыманне тытула «Зона свабоднага прадпрыймальніцтва». Гарэлка, пасля ўвядзення талоннай сістэмы, у інтэрнаце № 7 на пяць рублёў даражэй, чым у другім. Адпаведна 30 і 25 рублёў за бутэльку.

З палівам — справа дрэнь. 5 рублёў — за пачак добрых цыгарэт, 2—3 — папяросак (стыпендыю можна «прапаліць» за 20 дзён, калі нерацыянальна разлічваць на пачак у дзень). Асаблівай папулярнасцю карыстаецца «Астра».

## ЗАГАД №

## 613-К

Нарэшце, дачакаліся дэканы факультэтаў «вольнай». З выхадам загаду «Аб прадастаўленні дэканам факультэтаў права аказання матэрыяльнай дапамогі студэнтам» пашырылася рэальная самастойнасць гэтых падраздзяленняў.

— Што ж выйграў студэнт? — пытаюся ў начальніка аддзела кадраў А. М. Чэкана.

— Час. Калі раней ён траціў яго на хаджэнне з заявай аб выдзяленні матэрыяльнай дапамогі па інстанцыях і збіранне шматлікіх подпісаў, то зараз яму дастаткова атрымаць «дабро» толькі ад дэкана (вядома, пры наяўнасці хадайніцтва грамадскіх арганізацый{.

## ПАДЦЯГНІСЯ!

# Пра валейбол, футбол і... дэфіцыт адказнасці

Звычайна напярэдадні Новага года мы спяшаемся развітацца са старымі даўгамі. Ёсць народная прыкмета: новы год пачынай абавязкова чыстым, тады ён будзе багатым і спрыяльным. Але не заўсёды можна пакінуць у старым годзе леташнія клопаты.

Не могуць расквітацца «пад чыстую» з годам мінулым і універсітэцкія спартсмены. Традыцыйная студэнцкая спартакіяда, як звычайна, пачалася ў 1990 годзе, а закончыцца ажно ў новым дзесяцігоддзі. Што ж паказаў год мінулы?

Апошнімі днямі снежня змагаліся за званне чэмпіёна універсітэта валейбалісткі. Але, відаць, папярэднія спаборніцтвы пакрысе забіралі ў іх сілы і на гэтыя некаторым факультэтам не хапіла духу. Зусім абяссілелі дзяўчаты філалагічнага, філасофска-эканамічнага і радыёфізічнага факультэтаў. А інакш чым растлумачыш, што «дзявочы» факультэт (няхай на радыёфізіцы і ФЭФе малавата слабага полу, а філфаку скардзіцца нельга) не змог выставіць на спаборніцтвы сваю каманду?

— Ды і тыя, хто ўдзельнічаў у Сартакіядзе, паказалі нізкі ўзровень гульні, — адзначыў галоўны суддзя спаборніцтваў М. М. Кучынскі. — Выключэнне склалі каманды ФПМ і біяфака, якія занялі адпаведна першае і другое месцы. Нядрэнна згулялі фізфакаўкі — у іх трэці вынік. Першынство паказала, што неабходна ўсё ж больш сур'ёзна і адказна рыхтавацца да Спартакіяды.

Таксама ў мінулым годзе прайшлі і спаборніцтвы па мініфутболу. Зноў у лідэрах ФПМ, праўда, на гэты раз уступіўшы першынство юрфаку. На трэцім месцы — радыёфізікі. А вось ФЭФ зноў у хвасце, разам з мехматам і гістфакам. Дарэчы, на папярэдняй Спартакіядзе мехмат выступаў значна лепш. У новым годзе, мусіць, трэба крышачку падцягнуцца і рэабілітаваць сябе. А такая магчымасць ёсць — наперадзе яшчэ спаборніцтвы па шахматах, футболу, гіраваму спорту, плаванню, баскетболу, цяжкай і лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту. Прычым, графік гульняў будзе даволі напружаным: за тры месяцы мінулага года праведзены спаборніцтвы па пяці відах, а на гэтакі ж час сёлетняга засталося амаль у тры разы больш. Так што не ўсё яшчэ страчана.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

# Лабараторыя па-за планам

Загад чулі? Заўважаць усё цікавае і значнае, што ёсць ва універсітэце!

Вы лічыце, што вас гэта не датычыць, бо і без загаду ўмееце выдзяляць галоўнае? Праверце сябе, калі ласка. Прапануем пытанне. Назавіце падраздзяленне (службу, арганізацыю, установу), якая існуе ў БДУ пад кіраўніцтвам аднаго з нашых прафесараў, але пакуль не мае памяшкання ва універсітэце і фінансуецца таксама не з яго сродкаў.

Не ведаеце? Тады маленькая падказка: арыентавацца ў пошуках вам трэба на юрыдычны факультэт. Толькі не бяжыце туды з гэтым пытаннем, нават там вам мала хто на яго адкажа. Лепш прыміце яшчэ крыху інфармацыі. «Загадкавы аб'ект», які вам трэба назваць, можна лічыць галоўным доказам таго факта, што юрысты Беларускага дзяржаўнага універсітэта таксама падключыліся да распрацоўкі праблем, звязаных з ліквідацыяй вынікаў Чарнобыльскай аварыі.

Вішнуем вас, калі здолелі даць адказ. Праверце, на ўсялякі выпадак, яго правільнасць. Гаворка ідзе пра навуковую лабараторыю сацыяльна-прававых даследаванняў па ўдасканаленню экалагічнага і сельскагаспадарчага заканадаўства. Не абавязкова запамінаць адразу такую складаную і доўгую назву, справа не ў ёй. А ў тым, што лабараторыя пачала дзейнічаць яшчэ год назад, хоць набыла афіцыйны статус значна пазней. Яе супрацоўнікі за гэты тэрмін зрабілі даследаванні ў Гомельскай вобласці і Валожынскім раёне. Вынікі праведзенага імі анкетавання насельніцтва гэтых рэгіёнаў могуць зацікавіць не толькі спецыялістаў па радыялогіі. Перш за ўсё яны павінны перапыніць спакой адказных асоб, якія сцвярджаюць, што там, на названых тэрыторыях, усё ў парадку, тых артыстаў, якія не спяшаюцца ехаць туды на гастролі, тых урачоў, якія не імкнуцца затрымацца там, у выніку чаго некаторыя населеныя пункты існуюць нават без фельчарскага пункта. На пытанне анкеты, ці магчыма пражыванне на заражанай тэрыторыі, адмоўна адказалі 67 працэнтаў жыхароў Брагінскага, больш чым 90 — Хойніцкага і прыкладна столькі ж — Нараўлянскага раёнаў.

Такія ж несуцяшальныя адказы далі і тыя гамяльчане, каго перасялілі ў 1986 годзе. Нічога дзіўнага — 2 мільёны 400 тысяч гэтых людзей зноў трапілі тады на забруджаныя тэрыторыі.

Загадчык лабараторыі сацыяльна-прававых даследаванняў па ўдасканаленню экалагічнага і сельскагаспадарчага заканадаўства, доктар юрыдычных навук, прафесар Анатоль Іванавіч **БОБЫЛЕЎ** праводзіў анкетаванне асабіста, таму пабачыў яго вынікі не толькі на паперы, але і на ўласныя вочы. У распрацоўцы анкет яму дапамагаў акадэмік АН БССР Я. Ф. Канапля. Жывыя ўражанні аб жыцці на Гомельшчыне падштурхнулі арганізатараў лабараторыі да наступнага кроку. У чэрвені яны распаўсюдзілі ў Вярхоўным Савеце БССР вынікі праведзенага анкетавання. А таксама пасадзейнічалі прыняццю рашэння аб распрацоўцы двух важных законаў: «Аб Статусе тэрыторый, што падверглiся радыеактыўнаму забруджванню» і «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад ядзернай катастрофы». Абодва праекты зараз рыхтуюцца да прыняцця спецыяльнай камісіяй Вярхоўнага Савета.

Канстытуцыю БССР лабараторыя таксама не збіраецца «пакідаць у спакоі». Ёсць намер дабіцца ўключэння ў яе асобнай главы пад назвай «Экалагічная бяспека і экалагічнае развіццё» — праект ужо перададзены ў канстытуцыйную камісію.

Плануецца яшчэ... Дарэчы, спецыяльных планаў у лабараторыі не складаюць, каб яны не перашкаджалі паспяваць за бегам жыцця. Напрыклад, кантраляваць эфектыўнасць прымаемых у нашай дзяржаве законаў — з дапамогай таго ж анкетавання.

Лабараторыяй ужо выдадзены першы навукова-метадычны дапаможнік па экалагічнаму праву, у плане — падручнік, які будзе падрыхтаваны на гасразліковай аснове.

Пастаянных супрацоўнікаў лабараторыя не мае, яна дзейнічае па прынцыпу часовых творчых калектываў. Але ў яе ўжо ёсць свае «актывісты»: дэкан юрыдычнага факультэта В. М. Гадуноў і дырэктар студэнцкага цэнтра, пры якім лабараторыя, дарэчы, і існуе, Сяргей Балашэнка.

В. БЯГУН.

## ГОСЦЬ З-ЗА МЯЖЫ

# УТАПІСТ З ЙЕНЫ

Замежныя кантакты сталі справай звычайнай. Але іх вынікі застаюцца прыемнай нечаканасцю ў кожным выпадку, і асабліва гэта датычыць іх чалавечага аспекта.

Прафесар Пауль **МІТЦЭНХАЙМ** з Йенскага універсітэта, даўні сябар кафедры педагогікі БДУ, на гэты раз прыязджаў да нас... проста так. Не лекцыі студэнтам пачытаць, не вопытам вучэбным ці навуковым абмяняцца з калегамі, а пагутарыць з імі пра тое-сёе. Хто ведае, што можа быць больш карысным, чым цёплая гутарка за гарбатай...

Тым, хто ведаў прафесара раней, пэўна, было асабліва цяжка паверыць, што ён прыехаў з таго ж Йенскага універсітэта, што, нарэшце, гэта той жа чалавек. Бо змянілася на нямецкай зямлі за апошні час многае. Няма больш ГДР, чыёй маёмасцю быў Йенскі універсітэт раней, і жыве ён цяпер па іншых законах.

Кафедраў па марксісцка-ленінскіх навуках тут больш не існуе. Многія студэнты адмаўляюцца наведваць заняткі па такіх прадметах, як сучасная літаратура, грамадазнаўства, псіхалогія і педагогіка. І гадзін на гэтыя заняткі стала адводзіцца менш. Новае кіраўніцтва універсітэта — яно з'явілася пасля ўз'яднання Германіі — рэкамендавала секцыі педагогікі запрашаць спецыялістаў з ВНУ, якія належалі былой ФРГ. Зараз секцыяй педагогікі не можа загадваць чалавек з ліку яе выкладчыкаў, і на яго месца можа быць прапанавана некалькі дзесяткаў кандыдатур з усёй Германіі. Дарэчы, і такога падраздзялення, як секцыя, больш не будзе існаваць — універсітэт цалкам звернецца да сістэмы факультэтаў.

З 1991 года ў ВНУ Германіі будуць уводзіцца інструкцыі і патрабаванні, адпаведныя тым, што дзейнічаюць у навучальных установах, размешчаных на тэрыторыі былой ФРГ. Гэта азначае, што выкладчыкаў і студэнтаў чакаюць змены не толькі ў раскладзе заняткаў. Усе выкладчыкі, якія маюць вучоную ступень, будуць пераведзены на кантрактную сістэму працы. І кожны выкладчык, са ступенню ці без яе, павінен прайсці атэстацыю. Для гэтага трэба запоўніць аб'ёмную анкету, змест якой ацэніць камісія ў складзе 10 прафесараў з Бона і рэктара універсітэта. Па папярэдніх падліках, каля 50 працэнтаў выкладчыкаў у хуткім часе будуць звольнены.

«Памаладзеюць» пенсіянеры. Раней выкладчыкі мелі права ісці на заслужаны адпачынак у 75 гадоў, зараз мужчыны павінны зрабіць гэта не пазней, чым у 57, а жанчыны — чым у 55 гадоў.

І яшчэ шмат змяненняў напаткае ВНУ, якія калісьці належалі ГДР, а цяпер сталі агульнагерманскімі. Але прафесар Пауль Мітцэнхайм сцвярджае, што ён па-ранейшаму застаецца ўтапічным сацыялістым. Педагогам жа, на яго думку, проста наканавана быць утапістамі, нават цяпер, калі сацыялізм на нямецкай зямлі называюць няўдалым эксперыментам...

# РАЗМАРОЗІЛІ... СТЫПЕНДЫЮ

***Ці не апынуцца заўтра студэнты за рысай беднасці — паталок цэн падымаецца ўсё вышэй і вышэй, а стыпендыі «замарозілі» дваццаць гадоў назад (у 1971 годзе была прынята пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў).***

***Апошняе рашэнне Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб прыняцці дадатковых мер па паляпшэнню матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў і навучэнцаў наўрад ці можна лічыць панацэяй ад усіх матэрыяльных бед, што падпільноўваюць іх у час рыначных адносін. Якія ж гарантыі дае пастанова?***

***Спадзяемся, адказ на гэта пытанне вы знойдзеце ў інтэрв'ю з галоўным бухгалтарам БДУ імя У. І. Леніна В. П. САЛАДУХА.***

— У прынятым дакуменце ідзе размова не толькі аб павелічэнні памеру стыпендыі. Хоць ён і абмежаваны — 60 рублёў у месяц незалежна ад курса і абранай спецыяльнасці, тым не менш заканадаўцы не забыліся пра стымул — захоўваецца павышаная стыпендыя. Тыя, хто паспявае на «выдатна», атрымаюць пяцідзесяціпрацэнтную надбаўку, а «харашысты» — дваццаціпяціпрацэнтную.

Акрамя таго, калі студэнт заключыў індывідуальны дагавор з прадпрыемствам, арганізацыяй ці ўстановай, ён мае права разлічваць і на даплату ад свайго «апекуна». У такім выпадку стыпендыя можа пераваліваць за сто рублёў.

**— Баюся памыліцца, але калі я дакладна зразумела пастанову, каб атрымаць прыбаўку да стыпендыі, студэнту зусім не абавязкова шукаць «апекуна» па-за сваёй установай?**

— Так. Дакумент дае «дабро» на ўдзел студэнтаў у навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх работах непасрэдна ў сваіх навучальных установах. На аплату іх працы дазволена выдзяляць не менш дзесяці працэнтаў агульнага фонду заработнай платы па навуцы.

**— І ўсё ж гэта наўрад ці гарантуе студэнту не толькі лусту хлеба на стале, але і нешта да яго. І апрануцца маладому чалавеку хочацца модна.**

— Калі наш падапечны апынуўся ў крытычнай сітуацыі, ён можа звярнуцца ў фонд сацыяльнай дапамогі студэнтам, якія маюць вострую патрэбу. Па рашэнню савета ВНУ такі фонд можа быць створаны ў любой вышэйшай навучальнай установе. Ён будзе папаўняцца за кошт эканоміі стыпендыяльнага фонду і сродкаў, атрыманых з іншых крыніц, так званых пазабюджэтных.

**— Ну, а калі студэнту патрэбна, скажам, не 50 рублёў, а 500?**

— Няхай бярэ пазыку. Даецца яна тэрмінам на дзесяць гадоў. Вядома, выплаціць яе ў час вучобы немагчыма, таму вяртаць грошы дзяржаве студэнт пачне з першага года работы. Праўда, тут ёсць невялікае «але». Ашчадбанк вырашыў крыху, так бы мовіць, падстрахавацца і выдае крэдыты толькі студэнтам трэцяга курса, прычым, сямейным, па хадайніцтву рэктарата і грамадскіх арганізацый.

**— Валянціна Пятроўна, і апошняе пытанне: ва ўмовах нашай сённяшняй галечы дзе возьмуць ВНУ грошы на паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў?**

— Частку сродкаў ВНУ павінны будуць шукаць самі, як сказана ў пастанове, за кошт упарадкавання падрыхтоўкі спецыялістаў, развіцця дагаварных узаемаадносін з прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі народнай гаспадаркі.

Для гэтых мэт будзем выкарыстоўваць палову грошай, якія паступаюць ад нашых заказчыкаў як частковае пакрыццё затрат на падрыхтоўку маладога спецыяліста, якога яны бяруць на работу. Карацей, трэба не сядзець склаўшы рукі, бо грошы самі не прыйдуць.

Гутарыла
**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

## ПАСЛЯСЛОЎЕ ДА ЛЁСУ

# Прафесія — вучоны

Доктару гістарычных навук, прафесару, заслужанаму дзеячу навукі Льву Міхайлавічу Шнеерсону споўнілася 80 гадоў. Адначасова мы адзначаем 60-годдзе яго навукова-педагагічнай дзейнасці, а таксама больш за 50 гадоў яго плённай працы ў БДУ.

**У 1937 годзе Л. М. Шнеерсона запрашаюць у Мінск, дзе ў Белдзяржуніверсітэце ён узначаліў кафедру новай гісторыі. У 1938 годзе ён быў вылучаны на пасаду прарэктара па вучэбнай рабоце.**

У пачатку 1941 года Л. М. Шнеерсон закончыў работу над кандыдацкай дысертацыяй, аднак вайна перашкодзіла яе абараніць. Яна загінула пры пажары ў час бамбардзіроўкі горада нямецкай авіяцыяй у пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Калі восенню 1943 года на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў работу Беларускі універсітэт, Л. М. Шнеерсон зноў узначаліў кафедру новай і навейшай гісторыі. Ён прымае актыўны ўдзел у рээвакуацыі універсітэта ў г. Мінск, у яго станаўленні ў цяжкія пасляваенныя гады.

У 1946 годзе Леў Міхайлавіч Шнеерсон паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Вучоны выключнай культуры і ўсебаковых ведаў, ён стварыў шэраг фундаментальных даследаванняў, якія атрымалі высокую адзнаку ў айчынным і замежным навуковым друку. Цэнтральнае месца ў іх займаюць важныя праблемы гісторыі міжнародных адносін у Еўропе другой паловы XIX стагоддзя. Гэтым пытанням прысвечаны яго манаграфіі.

Спіс навуковых работ Л. М. Шнеерсона даволі змястоўны — іх каля 130. Ён унёс значны ўклад у падрыхтоўку першай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, з'яўляючыся членам рэдкалегіі і аўтарам шматлікіх артыкулаў па новай гісторыі дзяржаў Еўропы і Амерыкі.

Усе працы вучонага вызначаюцца не толькі вялікай тэарэтычнай глыбінёй, дакладнасцю метадалагічных пазіцый і багаццем канкрэтнага матэрыялу, але і выдатным літаратурным стылем.

Неабходна адзначыць, што Л. М. Шнеерсон старанна рыхтуе навуковую змену. Пад яго кіраўніцтвам абаронены больш чым дзесяць кандыдацкіх дысертацый.

Прафесар Л. М. Шнеерсон з'яўляецца прыкладам лектарскага майстэрства. Яго вучням заўсёды былі да спадобы высокая адукаванасць, шырыня кругагляду і чалавечая душэўнасць настаўніка.

**Д. МЕЛЬЦАР,**
прафесар.







**Ёсць шмат людзей, пра якіх мы, здаровыя, забыліся ў сваіх клопатах. Павіншаваць іх, жыхароў Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнай дапамогі пенсіянерам, перад навагоднімі святамі прыйшоў настаяцель Чырвонага касцёла ксёндз Уладзіслаў Завальнюк з памочнікамі. Ён правёў дабрачыннае багаслужэнне для людзей, якія гадамі не пакідалі чатырох сцен, а дзеткі абышлі палаты з падарункамі — яблыкамі, мандарынамі, цукеркамі.**

**— Святочнае наведванне такіх устаноў — гэта толькі палова справы,— лічыць ксёндз Уладзіслаў.— Трэба дабіцца таго, каб кожны прыхажанін меў душэўную патрэбу дапамагчы слабым і старым.**

**Фота С. ВАСІЛЬЕВА.**

## ПАСТФАКТУМ

# СУПРАЦЬСТАЯННЕ

**Надакучыла чуць адно і тое ж: вышэйшай школе неабходны тэрміновыя радыкальныя змены. І матэрыяльная база нікчэмная, і стыпендыя нашмат ніжэй пражытачнага мінімуму... Хто возьмецца за вырашэнне гэтых пытанняў, як знайсці зацікаўленых і неабыякавых? Падтрымаўшы ідэю аб правядзенні студэнцкага форуму рэспублікі, спадзяваліся на тое, што ён не будзе чарговай гаварыльняй, а дасць плён. Магчыма, так бы яно і здарылася, калі б не пэўныя акалічнасці.**

**Меркаванні мае будуць у нейкай ступені суб'ектыўныя, хаця б таму, што на рэспубліканскім форуме я прадстаўляў тую частку яго ўдзельнікаў, якая складала меншасць і стаяла на платформе Задзіночання беларускіх студэнтаў — самадзейнай грамадскай арганізацыі. Я не прэтэндую на ісціну ў апошняй інстанцыі і гатовы адстойваць свой пункт гледжання ў спрэчках з вамі. Якія ж думкі я мяркую абараняць і што вынес з сабой, пакінуўшы залу, дзе праходзіў форум?**

Дзіўная сітуацыя складваецца: студэнтаў, якіх усё задавальняе, сёння вельмі мала, практычна няма, але пры ўсім гэтым мы ў большасці сваёй грамадска пасіўныя, абыякавыя, калі не сказаць апатычныя. Мы ўсё спадзяёмся, што НЕХТА парупіцца, каб нам у хуткім часе жылося лепш. Толькі хто? Спачатку была кволая надзея, што гэта зробіць форум, але з першых гадзін работы стала зразумела: яго састаў не справіцца з такой задачай. Хутка ў студэнтаў з'явіліся скептычныя адносіны да форума. Прычына — у недэмакратычных выбарах яго дэлегатаў. Кожная ВНУ рэспублікі прадстаўляла пяць-шэсць пасланцаў. З іх у лепшым выпадку тры абіраліся студэнтамі, адзін — замежнымі навучэнцамі, а два — сакратары камітэтаў камсамола ці старшыні прафкомаў. Такі падыход антыдэмакратычны. Але каго гэта цікавіць? Галоўнае, што арганізатары яго заручыліся гарантыяй ажыццяўлення сваіх намераў (гэта, у першую чаргу, стварэнне выканаўчага камітэта форума, які б у сваёй дзейнасці выступаў ад імя ўсяго — ці пераважнай большасці — студэнцтва Беларусі). Не трэба доўга думаць, каб зрабіць выснову, за якія прапановы і за які састаў выканкома будуць галасаваць у большасці сваёй сакратары арганізацый-заснавальнікаў.

Калі ў канцы форума пры прыняцці выніковых дакументаў паступіла прапанова змяніць парадак прадстаўніцтва на наступны збор, у дыскусіі асноўным аргументам заснавальнікаў было выказванне загадчыка аддзела ЦК ЛКСМБ А. Шадэнкі, маўляў, у выпадку адмены сістэмы прамога прадстаўніцтва арганізацыі-заснавальнікі, якія і фінансавалі форум, могуць застацца ў меншасці. Залатыя словы. Тут і адказ на пытанне, каму быў патрэбны форум?

Фактычна ход форума быў барацьбой, супрацьстаяннем дзвюх канцэпцый выхаду з крызісу, барацьбой большасці і меншасці. Меншасць — платформа Задзіночання беларускіх студэнтаў (ЗБС), якая на пачатку пасяджэння мела 19 галасоў, а да ягонага фіналу набыла яшчэ з паўтара дзесятка прыхільнікаў. Большасць — нязменныя арганізатары-заснавальнікі.

У чым жа сутнасць розных падыходаў? Усе прапановы большасці накіраваны на тое, каб бараніць студэнта ад рынку, меншасці — каб рыхтаваць студэнта да рынку. Прадстаўнікі ЗБС адстойвалі ідэю стварэння радыкальнай самадзейнай студэнцкай арганізацыі, удзелам у рабоце якой навучэнцы ВНУ самі маглі б вырашаць узнікаючыя перад імі пытанні, самі адстойвалі б свае інтарэсы. Арганізатары ж дамагаліся бласлаўлення форумам выканаўчага камітэта пад эгідай ЛКСМБ, які б адстойваў інтарэсы студэнцтва рэспублікі, звяртаючыся ад імя форума ў органы дзяржаўнага кіравання.

Чым розняцца нашы прапановы па дзейнасці студэнцкай арганізацыі і ініцыятывы ЛКСМБ? Адказ мушу выкласці цытатай з праграмнай заявы ЗБС: «...у грунт іхняй платформы пакладзены выключна сацыяльна-бытавыя праблемы студэнтаў, нас не задавальняе ў цэлым існуючая канцэпцыя вышэйшай школы. Яны дзеюць па-за межамі палітыкі, мы актыўна закранаем палітычныя пытанні. Большасць рэформ, прапанаваных арганізатарамі, патрабуюць немалых фінансавых затрат, а гэта значыць, што вырашэнне іх цалкам залежыць ад вышэйстаячых органаў. Мы ўпэўнены, што многія важнейшыя пераўтварэнні можна зрабіць і без дадатковых сродкаў, сваімі сіламі. Фінансавага тормазу для нашых рэформ не існуе. Не скідаем з рахунку мы і пытанне аб нацыянальнай адукацыі, на нашу думку, адно з галоўных».

На жаль, большасцю галасоў ідэя самастойнай студэнцкай арганізацыі была адкінута. Аргумент — а навошта прафсаюз? Выканком жа створаны дзеля практычнага выканання рашэнняў форума. Толькі, здараецца, часта добрыя намеры застаюцца на паперы. Практычна без увагі пакінуты звароты першага форума. Пра гэта сведчаць памятныя для студэнтаў БДУ падзеі вясны 1989 года, калі ЗБС назбірала звыш 2 тысяч подпісаў пад прапановамі аб зменах у навучальным працэсе ў ВНУ рэспублікі, якія былі прыняты ў міністэрствах народнай адукацыі і культуры з абяцаннямі ажыццявіць іх, а на справе засталіся па-за ўвагай.

Але мы ведаем і нашы перамогі, напрыклад, адмену экзамена па гісторыі КПСС на геафаку, адстаўку рэктара інстытута замежных моў. Не зваротамі, а рашучымі дзеяннямі дамагліся студэнты гэтага. Сказанае дае падставы сцвярджаць, што ніякі выканаўчы камітэт са сваімі прапановамі не ў стане дапамагчы нам. Гэта недзеяздольная структура. На думку многіх удзельнікаў форума і тых студэнтаў, якія не прысутнічалі на ім, каб дасягнуць нейкіх змен у сістэме вышэйшай адукацыі, неабходна ажыццяўляць ідэю радыкальнай студэнцкай арганізацыі, хоць і без удзелу большасці.

**Ю. ГАЙДУК,**
сябра ЗБС.

## ЛЮСТЭРКА

**Чым запаўняюць вольны час сённяшнія студэнты? Параўнальны аналіз структуры вольнага часу сведчыць на карысць трох важнейшых элементаў штодзённага яго правядзення: зносіны з сябрамі (80 працэнтаў); праслухоўванне музыкі (55 працэнтаў); прагляд тэлеперадач (43 працэнты). Ці можа грамадства задавальняць такі змест вольнага часу будучых спецыялістаў?**

# Вольнаму — воля



Пры зносінах з сябрамі паказальным з'яўляецца факт імкнення да іх інфармацыйнага характару. 59 працэнтаў студэнтаў адзначылі, што важнейшым змястоўным аспектам зносін выступаюць гутаркі і спрэчкі па разнастайных праблемах (якія цікавяць іх). Сёння, калі наша жыццё так імкліва мяняецца, ступень інфармацыйнасці не толькі павышаецца, але і набывае новую якасць, якая заключаецца ў спробах рэальнага ўздзеяння (мітынгі, дэманстрацыі, удзел у выбарах у органы Савецкай улады) на рашэнне жыццёва важных пытанняў. Значнае месца ў працэсе зносін адводзіцца і такім заняткам, як: праслухоўванне музыкі (48 працэнтаў), наведванне кіно, стадыенаў, дыскатэк (39 працэнтаў), «проста гуляем» (27 працэнтаў), пэўных заняткаў няма (16 працэнтаў), спартыўныя гульні (11 працэнтаў). Месцам сустрэч часцей за ўсё бываюць: інтэрнат (57 працэнтаў), кватэры сяброў (44 працэнты) і вуліца (16 працэнтаў).

Сама вучоба як тэма зносін пры сустрэчах займае пятае месца, уступаючы музыцы, тэлеперадачам, кінафільмам, пытанням моды і кахання. У некаторых выпадках такія сутрэчы суправаджаюцца ўжываннем спіртных напіткаў.

Паступова пераадольваецца і палітычная індыферэнтнасць. Парадаксальнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што большасць маладых людзей (кожны паасобку) цікавіцца палітычным жыццём краіны і свету ў цэлым, называючы сярод любімых перадач і палітычныя. Але абмяркоўваць іх у кампаніі не прэстыжна і не прынята. Праблема ўзмацнялася яшчэ і адсутнасцю ў большасці студэнтаў асабістай акрэсленай думкі па палітыка-эканамічных пытаннях. Палітызацыя многіх грамадскіх рухаў, якая адбываецца цяпер, садзейнічае росту грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, фарміраванню іх палітычнай свядомасці і культуры. На гэты працэс аказвае моцнае ўздзеянне нефармальны рух у краіне, які прыцягвае моладзь папулярным лозунгам і фразай. У гэтым — аднабаковасць фарміравання палітычных поглядаў і арыентацый, якія заключаюцца пераважна ў крытыцы нашай рэчаіснасці і мінулага.



Мы часам кажам, што пэўнай частцы моладзі ўласцівы інфантылізм, пасіўнасць. На нашу думку, мы маем прыклад высокай ступені іх сацыяльнага прыстасаванства, простай адаптацыі да ўмоў жыцця. Авалодаўшы гэтым, маладыя людзі займаюць пазіцыю пабочнага назіральніка або, імкнучыся выйсці з гэтага «аб'ектнага кола», зацвярджаюць сябе ў разнастайных нефармальных групах.

І яшчэ адзін істотны аспект гэтай праблемы. Даказана вядучая роля дзейнасці ў фарміраванні сацыяльнай сутнасці зместу зносін. Гэта сцвярджэнне важна і для зносін моладзі. Але змест накіраванасці іх зносін у большай ступені звязаны толькі з вольным часам і ў меншай — з асноўнай, вучэбнай. Значыць, сапраўдная арганізацыя вучэбнай дзейнасці не ўцягвае іх цалкам у працэс авалодання ведамі, навуковага спазнання свету і г. д., што мае на ўвазе ажыццяўленне пазнавальных дзеянняў і ў вольны час. А гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да аслаблення фарміравання сістэмы духоўных патрэб: у творчасці, ведах, працы. Наяўнасць жа іх з'яўляецца крайне важнай на сучасным этапе развіцця нашага грамадства, калі ў аснову паскарэння пакладзена жывая творчасць мас. А калі яна (жывая творчасць) не фарміруецца са школы, не развіваецца ў працэсе вучэбнай дзейнасці ў ВНУ — адкуль жа потым ёй узяцца?

Разважаючы над фактамі, якія раскрываюць змест вольнага часу моладзі, прыходзіш да несуцяшальных вывадаў: яна імкнецца запоўніць яго забаўляльнымі заняткамі, пасіўным спажываннем культуры. Нават такія простыя формы, як тэхнічная творчасць, калекцыяніраванне, авалоданне ігрой на музычных інструментах займаюць (у параўнанні з формамі спажывання культуры) нязначнае месца ў структуры вольнага часу. Паскарэнне тэмпаў жыцця, павелічэнне псіхалагічных нагрузак патрабуе пастаяннага ўзнаўлення фізічных, псіхалагічных сіл. Дасягнуць гэтага немагчыма без заняткаў спортам. Аднак фізічная культура не «ў пашане» ў большасці маладых людзей. У спартыўных секцыях трэніруецца 29 працэнтаў апытаных, 65 — спортам наогул не займаюцца. Некаторыя спрабуюць займацца спортам самастойна, але іх працэнт невялікі.

Культурная неразвітасць звужае дыяпазон духоўных інтарэсаў, што вядзе да канцэнтрацыі ўвагі на нейкім адным відзе дзейнасці. Фарміруюцца надзвычай сур'ёзныя адносіны да свайго хобі (рок-музыка, матацыклы або спартыўнае «хварэнне»), якія з цягам часу замяняюць духоўнае жыццё, становяцца духоўным наркотыкам. Такое «монакультурнае» развіццё можа на пэўным этапе патрабаваць штучнага ўзвінчвання нервовай сістэмы для больш поўнага, эфектыўнага эмацыянальнага перажывання свайго любімага занятку (гэтай мэце служаць наркотыкі, таксічныя рэчы, алкаголь). Далей (культурная) духоўная абмежаванасць суправаджаецца, як правіла, нецярпеннем любога іншадумства, агрэсіўнымі адносінамі да ўсяго, што выходзіць за межы асабістых магчымасцей разумення. Так, 0,8 працэнта апытаных адказалі, што могуць ударыць чалавека толькі за тое, што ён «хварэе» за іншую спартыўную каманду або аддае перавагу іншаму музычнаму напрамку. Да сілы, як спосабу рашэння ўсіх канфліктаў, апелююць 1,3 працэнта студэнтаў.

Беднае сацыякультурнае асяроддзе, нізкі ўзровень культурнага развіцця з прэстыжна-забаўляльнай матывацыяй фарміруе скажоную структуру каштоўнасцей асобы апытанай моладзі. Пасля ўсіх праведзеных апытанняў выдзелілася некалькі набораў каштоўнасцей, якія найбольш значныя для розных катэгорый моладзі. Так, у першы набор, характэрны для трэцяй часткі студэнтаў, увайшлі наступныя кампаненты: «фірменныя рэчы», «кар'ера», «секс», «грошы». Пэўна, у свядомасці маладых людзей з іх складаецца эталонны вобраз асабістай будучыні: быць добра апранутым, мець перспектыўную работу, весці свабоднае сексуальнае жыццё. Другі па значнасці набор у студэнтаў склалі: «каханне», «імкненне стварыць сям'ю», «цікавая прафесія». Носьбітамі гэтых каштоўнасцей з'яўляюцца ў асноўным дзяўчаты. Трэці набор («прыкладнага вучня») улючае «павагу да старэйшых», «вучобу», «творчасць».

З усёй шчырасцю трэба прызнаць, што скажоныя, са спажывецкім «душком» каштоўнасці большай часткі моладзі — дакладнае люстэрка скажоных каштоўнасцей «дарослай культуры» перыяду застою.

## ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

# І чуткам можна верыць

**Дзіма засяроджана назіраў за кавай: нельга дапусціць, каб яна перакіпела. Тады ўжо смак не той, а трэба трымаць марку — многія наведвальнікі сцвярджаюць, што кава ў яго лепшая, чым у якім іншым кафэ. Вядома, Дзіма, як і ўсе самакрытычныя людзі, упэўнены, што яны перабольшваюць, і ўсё ж прыемна чуць пахвалу ў свой адрас.**

Дзмітрый Шымановіч за два месяцы сваёй работы ў студэнцкім кафэ, што размясцілася на першым паверсе інтэрната № 1 БДУ імя У. І. Леніна, амаль усіх сваіх гасцей ведае ў твар, таму чалавека пабочнага заўважыў адразу.

— Што вам: кава, кактэйль, марожанае — выбірайце,— прапанаваў ён ціхім, прыемным голасам.

Гэта атрымалася неяк нечакана для мяне і замест таго, каб зрабіць заказ, я назвала сябе. Усё тым жа спакойным голасам ён папрасіў у наведвальнікаў прабачэння і згадзіўся ахвяраваць мне некалькі хвілін для размовы. Сеў насупраць, расслабіўся, закурыў цыгарэту. Хоць стаяў за стойкай бармэн ужо больш пяці гадзін, на яго твары не было і ценю стомленасці. Наадварот, нават гаворачы аб праблемах, якіх і тут, безумоўна, хапае, ён імкнуўся не страчваць пачуццё гумару.

— Таго, хто прыйшоў да нас адпачыць, не павінны кранаць нашы клопаты,— перакананы Д. Шымановіч.— Мы абавязаны стварыць ім такую атмасферу, якая дапамагла б расслабіцца, зняць напружанне, забыць пра непрыемнасці.

Гэтаму спрыяе і ўтульная, амаль інтымная абстаноўка: прыгожы, мяккі колер сцен, цёмныя, ствараючыя паўзмрок, шторы, настольныя лямпы, ціхая, павольная музыка...

За столікам справа чацвёра студэнтаў аб чымсьці заўзята спрачаюцца. Спрабую даведацца, ці падабаецца ім у кафэ.

— Так. Тут можна выпіць кубачак кавы ці стакан кактэйля, адсвяткаваць дзень нараджэння, проста пагутарыць. Раней такой магчымасці мы не мелі, а зараз вельмі ўдзячны яе з'яўленню. Дарэчы, не так даўно тут можна было паглядзець і відзік, аднак тым, хто арганізаваў гэту справу, акрамя клопатаў відэасалон нічога не даваў — увесь прыбытак ішоў на выплату падатку. І ён паціху закрыўся.

Варта дадаць, што абсталявана кафэ не без дапамогі студэнтаў. Ды і зараз яны тут гаспадараць — замянілі абслугу. Самі прыбіраюць сталы, мыюць посуд. Ім гэта як раз дарэчы: прыбаўка да ўласнага бюджэту ў выглядзе зарплаты за працу ў кафэ хоць крыху дапаможа ў барацьбе з рынкам.

...Ля стойкі — чарговыя наведвальнікі. Бармэн ветліва прапануе: «Кактэйль, бутэрброд, каву?»

— Абавязкова каву, кажуць, яна ў вас самая смачная.

— Пераканайцеся самі.

У вас таксама ёсць магчымасць зрабіць гэта. Завітайце ў студэнцкае кафэ інтэрната № 1 з 14 да 21 гадзіны і вы пераканаецеся, што чуткам таксама можна верыць.

**З. МІХНЕВІЧ.**

## САКРЭТ ФІРМЫ

# Вучоба па прэйскуранту

*Нішто сабе прапановачкі прагучалі на пасяджэнні савета Петразаводскага універсітэта! Цяпер быць «двоечнікам» не толькі непрэстыжна, але і матэрыяльна немэтазгодна. Залік за межамі сесіі — дзе мае ні прападала! — 10 рублёў, «прагул» лабараторных работ — 15. Экзамен за межамі сесіі роўны па фінансавых стратах заліку для аднаўлення — 20 рублёў. Экзаменацыйная камісія патрабуе выняць ды пакласці 30 рублёў за экзамен для аднаўлення. А калі, здавалася б, можна ўжо вольна ўздыхнуць — зноў плаці за бясхмарнае існаванне ў мінулым, бо паўторнае навучанне на курсе каштуе 1000 рублёў.*

*Цяжка «двоечніку», вельмі цяжка. Затое паспяваючыя сакурснікі павінны, пачуўшы гэту навіну, да столі падскокваць — грошы пералічваюцца на рахунак універсітэта для... рашэння сацыяльных праблем студэнтаў.*


## РЭКЛАМА

**ФІЛІЯЛ ІНСТЫТУТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ І СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ГАНДЛЮ МІНГАНДЛЮ СССР г. МІНСКА**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД**

Старшага выкладчыка, кандыдата юрыдычных навук па курсу «Працоўнае і гаспадарчае заканадаўства» (1)

Старшага выкладчыка па курсу «Новае ў таваразнаўстве харчовых тавараў» (0,5)

Старшага выкладчыка па курсу «Тэарэтычныя асновы і праблемы развіцця рыначных адносін» (1)

Дацэнта, кандыдата эканамічных навук па курсу «Арганізацыя і тэхналогія гандлю» (1).

Тэрмін конкурсу — месяц са дня апублікавання аб'явы.

Філіял жылплошчай не забяспечвае.

АДРАС: 220038, МІНСК, ВУЛ. БАТАНІЧНАЯ, 15. ТЭЛ. 36-80-34.


## АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

# Нашто перашкаджаць Пушкіну?

Мітусня. Залікі. Іспыты. Каму мы «лапшу на вушы вешаем»? Сабе, выкладчыку, будучаму начальніку?

Не аспрэчвайце! За сценамі універсітэта веды па многіх прадметах проста непатрэбныя. У той жа час кожная кафедра імкнецца «ўдзяўбці» студэнту як мага болей. Атрымліваецца...

Ноч, кава, гара канспектаў, савецкі студэнт. Наступны дзень прынясе бязмежнае гора ці несупынную радасць і абавязкова пустэчу ў душы. Такі наплыў інфармацыі за кароткі тэрмін можна засвоіць, але ўтрымліваць у галаве больш за адзін дзень — немагчыма. Ці не лепш вылучыць некалькі асноўных курсаў, а астатнія зрабіць факультатыўнымі? Каб інфармацыйным дыктатам выкладчыкі не перашкаджалі так актыўна развіццю асобы. А, па-мойму, ВНУ павінна толькі накіроўваць, падказваць, дапамагаць студэнту атрымліваць неабходныя веды.

Адзнакі ж... Памятаеце, на якім «табельным» месцы быў Пушкін? На перадапошнім. І гэта не перашкодзіла яму стаць Пушкіным. Хаця невядома, хто б выйшаў з яго ў наш час.

**Мікалай ВАСІЛЕЎСКІ,**
**студэнт 2-га курса.**

# ДУМКІ ЎСЛЫХ

ПРАПАНУЕМ:

Адкрыць спецмагазіны для студэнтаў (па сацыяльна нізкіх цэнах) і выкладчыкаў, каб забяспечыць нас неабходнымі таварамі і прадуктамі, як гэта даўно заведзена на прадпрыемствах. (Дзе ўзяць нам час, каб выстойваць у бясконцых чэргах? А ўвечары, калі заканчваюцца заняткі, у звычайных магазінах паліцы пустыя).

Павысіць катэгорыі студэнцкіх сталовых, каб гатаваць стравы з дабраякасных прадуктаў. Цэны пакінуць ранейшымі. Розніца? Датацыі дзяржавы ці дапамога прафсаюзаў.

Разгледзець мэтазгоднасць выкладання палітычнай эканоміі. Мы лічым, што вывучэнне прадмета не мае практычнай накіраванасці.

**З. КАСПЯРЭВІЧ,**
**М. ДУБОЎСКАЯ,**
**студэнткі.**

# ДЛЯ ЦЯБЕ

## ВАМ, ПРЫГАЖУНІ

*Сёння мы пачынаем друкаваць для вас комплекс гімнастыкі, якая хутка здабыла папулярнасць ва ўсім свеце, бо дапамагла многім жанчынам стварыць прыгожую постаць. Паспрабуйце, і вы пераканаецеся ў яе цудоўным эфекце.*

# КАЛЭНЕЦІКС

### УСТУПНЫЯ ЎКАЗАННІ

1. Не прымушай сваё цела рабіць тое, да чаго яно не падрыхтавана. Спачатку часта адпачывай на працягу практыкаванняў, глыбока дыхаючы пры гэтым. Калі адчуеш боль у мышцах пасля выканання 25 паўтораў (а трэба выканаць 100), не ператамляйся.

2. Было б ідэальным, каб у цябе было вялікае люстэрка, у якім ты б змагла назіраць, як паводзіць сябе цела ў час практыкаванняў. Для некаторых з іх спатрэбіцца што-небудзь устойлівае: напрыклад, паверхня пісьмовага стала. Не мае значэнне, як ты апранута, толькі было б зручна.

3. Памятай пра спакойнае, натуральнае дыханне. Затрымаўшы яго, не данясеш арганізму неабходнага для забеспячэння мышц і ачышчэння крыві кіслароду.

4. Цішыня — золата. Калі ўключыш музыку, будзеш інстынктыўна рухаць целам у яе рытме і страціш кантроль над практыкаваннямі.

5. Схавай і нават наогул вынясі з дому вагі, каб не ўзважвацца кожны дзень. Перасцерагаем, што спачатку можаш нават не дабіцца поспеху, хоць будзе мокры ручнік. Прычына простая: моцна напружаныя мышцы важаць больш, чым друзлыя, але займаюць меншую плошчу.

ЖАДАЕМ ПОСПЕХУ!

### РАЗМІНКА

Не думай, што гэта нешта тое, што не на карысць, бо выконваецца перад непасрэднымі практыкаваннямі. Без размінкі нельга абысціся, ёю нельга грэбаваць, бо яна садзейнічае разагрэву мышц, падняццю тэмпературы цела і цыркуляцыі крыві для большай актыўнасці. На гэтым этапе практыкаванняў паслабляецца напружанасць мышц, а таксама распускаецца касцявая структура.

1. На крэсле з апорай рукамі на яго бакавыя ручкі падняць сваё цела. Важна трымаць спіну прама і схаваць падбародак, аслабіўшы ягадзіцы.

2. Стань прама з расстаўленымі не шырэй чым на 35 сантыметраў нагамі, паднімі рукі ўверх і трымай так высока, як можаш. Уцягні жывот так, быццам адчуваеш, што ўсё цела падоўжылася на некалькі сантыметраў. На сагнутых каленях нахіліся ўперад, быццам хочаш нешта дастаць. Пацягніся ўперад. У гэтай пазіцыі перавядзі рукі назад і адначасова выцягні моцна ўперад шыю. Вярніся зноў уперад, а потым зноў назад. Паўтары гэта практыкаванне 5 разоў.

ДА СУСТРЭЧЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!



## ЖАДАЕЦЕ — ПАСПРАБУЙЦЕ

Ананімнае лячэнне ад алкагалізму, наркаманіі, курэння і сексапаталогіі можна атрымаць на вуліцы Некрасава, 22. Тэлефон 32-31-03.

Паспрабаваць пазбавіцца ад курэння з дапамогай метаду рэфлексатэрапіі запрашае кабінет № 602 33-й студэнцкай паліклінікі. Тэлефон 31-33-97.

# ЯК ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАВАЦЦА ВЯСЁЛЫМ

Згадзіцеся, гэта сапраўдны талент — знаходзіць паўсюдна нагоду для весялосці. У нашым зусім не радасным жыцці асабліва. Тым не менш, паспрабуйце правесці некалькі эксперыментаў, і вы зразумееце, што таксама можаце стаць уладальнікам такога таленту. Лепшае месца для падобных практыкаванняў — наша славутая чарга: і трапляецца штодзённа, і часу для назіранняў дае дастаткова, і людзей выяўляе ў самых нечаканых сітуацыях. Дык пачнём!

СПРОБА ПЕРШАЯ. На вас гучна лаецца прадавец. За што? Ну, можа вы папрасілі замяніць атрыманы ад яго кавалак сыру на другі, больш прывабны. Паспрабуйце не звяртаць увагу на яго абвінавачванні, як бы ні хацелася вам горача адказаць на словы: «Выбіраць яны яшчэ тут будуць! Бярыце, што даюць, пакуль гэта ёсць!» Не гаварыце нічога такога па настрою ў адказ, а лепш... усміхніцеся. І пяшчотным, ледзь чутным голасам вымавіце: «Прабачце мяне, калі ласка. Мне б было так прыемна атрымаць менавіта вунь той кавалак з вашых прыгожых рук. Будзьце так ласкавы...» Уяўляеце сабе эфект? Ці можа ўжо спрабавалі размаўляць спакойна з аматарамі лаянак і сварак? Тады павінны ведаць, што такая рэакцыя на перуны і маланкі з вуснаў раз'юшанага субяседніка спачатку можа давесці яго да шаленства. Але потым ён супакоіцца і абавязкова выканае вашу просьбу. А гэта ўжо нагода для весялосці, ці не праўда?

СПРОБА ДРУГАЯ. На гэты раз інцыдэнт адбываецца ў самой чарзе, без удзелу прадаўца. Вы стаіце тут ужо трэцюю гадзіну, і якраз на вас выпадае апошні кілаграм шакаладных цукерак. Вы ўжо поўныя цудоўнага прадчування, калі раптам гэтыя цукеркі дастаюцца чалавеку, які падышоў без чаргі. Сітуацыя сапраўды драматычная. Тут да месца заплакаць і пабялець ад злосці. І вы не стрымаліся — нагаварылі нахабніку усялякіх крыўдных рэчаў. Ён жа ў адказ выцяў вас торбай з «вашымі» ж цукеркамі. Паспрабуйце зрабіць неверагоднае — зноў жа ўсміхнуцца (не блытаць з нервовым смехам!), шчыра падзякаваць крыўдзіцеля і пажадаць яму ўсяго самага найлепшага (пажаданні лепш канкрэтна пералічыць — ад поспехаў у асабістым жыцці да пастаяннай удачы ў чэргах). Ёсць надзея, што той чалавек біць вас больш не будзе, больш таго, калі ён, не сканчаны нахабнік, то ў наступны раз не пераблытае канец чаргі з пачаткам. Вы толькі падумайце, якімі высакароднымі пададуцца такія вашы паводзіны астатняй «бесцукерачнай» чарзе. Чаму б не парадавацца такому выніку?

СПРОБА ТРЭЦЯЯ. У чарзе, што стаіць ля касы за авансам ці зарплатай, вы сярод апошніх. І якраз перад вашым носам касір зачыняе акенца, хоць да заканчэння яго працоўнага дня застаецца яшчэ пяць хвілін. Адначасова ён штурхае вас рукой, каб не перашкаджалі гучней пляснуць дзверцамі. Безумоўна, усё гэта вельмі непрыемна. Але не губляйцеся і не паддавайцеся суму. Нахіліцеся да зачыненага акенца і як мага весялейшым голасам паабяцайце касіру вярнуцца за грашыма на наступны дзень і скажыце, што будзеце вельмі рады зноў убачыць яе ветлівы твар і пачуць лагодны голас. Пасля гэтага маналогу ваш настрой абавязкова павінны ўзняцца!

СПРОБА ЧАЦВЕРТАЯ. Зноў бясконцая чарга. Цяпер за керамічнымі вырабамі. Пакупнікі з «галавы» чаргі купляюць толькі самыя прыгожыя адзінкі, наступныя — лепшае з таго, што застаецца. А тыя, каму даводзіцца прастаяць у чарзе найбольш часу, пачынаюць купляць усё без разбору, хоць на паліцах засталіся толькі няўдалыя вырабы. Калі ласка, не бярыце з іх прыклад! Пакіньце гэтую чаргу, будзьце мужныя, нават калі вы страцілі ў ёй некалькі гадзін. Няхай блізкі чалавек, для якога вы хацелі набыць тут падарунак, атрымае нешта больш сціплае ці наогул нічога. У святочны дзень вы раскажаце яму, як стаялі ў той чарзе і колькі камічнага бачылі... І разам з ім будзеце смяяцца! Нічога, калі крыху сумным атрымаецца гэты смех. Ён заўсёды такі, за выключэннем бяздумнага...

В. БЯГУН.

*HOmo SAPIENS*

# Высакамоўных слоў не трэба вам баяцца

Як вы думаеце, што адбудзецца з чалавекам, калі яму часта паўтараць: «Вы ж разумнік», ці «Вы ж цудоўны прамоўца», ці «Вы ж маеце добры ўплыў на людзей», хоць на самай справе гэта не зусім так? Правільна, праз некаторы час чалавек сапраўды паверыць у гэтыя «здольнасці» і будзе імкнуцца больш поўна рэалізаваць патэнцыял, які мае. Так. Гэта камплімент. І яго каштоўнасць для субяседніка абумоўлена пэўнымі псіхалагічнымі механізмамі, не ведаючы якія можна ператварыць камплімент у банальнасць, а ведаючы...

Калі чалавек пачуў, дапусцім, сто разоў, што ў яго «залатыя» рукі і яму проста пакуль не шанцуе, ён паверыць у гэта; калі пачуе пяцьдзесят разоў — таксама паверыць, але крыху слабей; калі дзесяць — вера ў тое, што ў яго «залатыя» рукі, будзе яшчэ слабейшая, але ж будзе! Бо ў аснове механізму дзеяння кампліментаў ляжыць ***псіхалагічны феномен унушэння.***

Урачы добра ведаюць, што лягчэй за ўсіх паддаецца ўнушэнню той, хто гэтага хоча, і лягчэй за ўсё можна ўнушыць тое, аб чым чалавек марыць. У эфекце ўнушэння адбываецца быццам «завочнае» задавальненне гэтай мары, гэтага жадання, гэтай патрэбы ва ўдасканаленні нейкага свайго характару. Фактычна патрэба пры гэтым не будзем цалкам задавальняцца, але рэальным будзе адчуванне яе задавальнення, узнікненне на гэтай глебе станоўчых эмоцый.

Вось як вымалёўваецца псіхалагічны механізм уплыву «залатых» слоў»:

1. Чалавек чуе ў свой адрас прыемныя словы, якія ўяўляюць сабой невялікае перабольшанне нейкіх яго станоўчых якасцей, г. зн. камплімент.

2. Калі камплімент зроблены па ўсіх правілах (пра іх — далей), дык узнікае эфект унушэння.

4. Як вынік унушэння — «завочнае» задавальненне патрэбы «выглядаць» у гэтым пытанні лепш.

4. Як вынік задавальнення патрэбы — утварэнне станоўчых эмоцый.

5. Станоўчыя механізмы выкліканы вамі, таму гэта па агульным механізме фарміравання атракцыі абумоўлівае яго прыхільнасць да вас з усімі спрыяльнымі вынікамі ў вашых з ім адносінах.

Дапусцім, у вас ёсць калега, які вельмі непрыемны вам. Аднойчы, сустрэўшыся з ім у прыёмнай вашага агульнага кіраўніка, вы пачулі ад яго наступнае: «Ведаеце, Н. Н., я ўвесь час здзіўляюся, як вам удаецца ўгаварыць яго (ківок у бок кабінета «шэфа»)?! Я ў мінулы раз паўтары гадзіны яго ўгаворваў, каб ён выдзеліў мне дадаткова работнікаў для выканання задання. І нічога не атрымалася! Вам жа гэта так лёгка ўдаецца. Можна пазайздросціць вашай здольнасці пераконваць людзей!»

Ведаючы яго, вы падумалі: «Вось ліслівец, вось падхалім!» А калі вы засталіся сам-насам са сваімі думкамі, пачалі разважаць так: «Зразумела, вам з вашай лабавой упартасцю цяжка пераконваць людзей. А наогул у мяне зрэдку нядрэнна атрымліваецца. Не ён адзін так гаворыць. Хоць, безумоўна, я разумею, што гэта перабольшанне, але наогул слушна!» І пачуццё законнага гонару авалодала вамі.

А цяпер пытанне: які эмацыянальны знак мае пачуццё законнага гонару — плюс ці мінус? Ну, зразумела, станоўчы! А хто з'явіўся крыніцай гэтых станоўчых эмоцый? Чалавек, які... непрыемны!

Але якім жа чынам яму усё ж удалося ў супрацьдзейных для сябе абставінах з дапамогай звычайнага кампліманта дасягнуць сваёй мэты?

Адразу ж агаворымся: ён выкарыстаў не звычайны камплімент. Гэты чалавек валодае адным з самых эфектыўных відаў кампліманта — кампілімент на фоне антыкампліманта сабе. Выкарыстанне гэтага кампліманта выклікае задавальненне адразу дзвюх патрэб чалавека. Першая — патрэба ва ўдасканаленні нейкай сваёй характарыстыкі. Дабаўкай жа да гэтага задавальнення з'явіліся словы Н.: «Паўтары гадзіны ўгаворваў і нічога не атрымалася».

Такім чынам, нават у сітуацыях, калі ваш партнёр ставіцца да вас з антыпатыяй (але пры гэтым размаўляе з вамі, г. зн. выконвае этыкет), з дапамогай прыёму «залатыя словы» вы зможаце выклікаць яго прыхільнасць да сябе. Зараз вы ведаеце, што пры гэтым адбываецца з чалавекам, вам зразумелыя ўсе патаемныя спружыны ўплыву кампліментаў на партнёра. Справа за малым — выкарыстаць гэтыя веды.

Перш чым даць у якасці «хуткай дапамогі» невялікі спіс кампліментаў, некалькі правілаў на тэму «Як зрабіць кампілімент кампліментам».

1. «АДЗІНЫ СЭНС». Кампілімент павінен адлюстроўваць станоўчыя, і толькі станоўчыя, якасці пэўнага чалавека. У кампліменце трэба пазбягаць падвойнага сэнсу, калі, напрыклад, даную якасць у чалавека можна лічыць і станоўчай, і адмоўнай.

2. «БЕЗ ГІПЕРБАЛ». Станоўчая якасць, якая адлюстроўваецца ў кампліменце, павінна мець невялікае перабольшанне.

3. «ВЫСОКАЕ МЕРКАВАННЕ». Важным фактарам у выніковасці гэтага прыёму з'яўляецца асабістае меркаванне чалавека аб узроўні развіцця адлюстраваных у кампліменце якасцей. Дапусцім, чалавек цвёрда ведае, што ўзровень гэтай якасці ў яго значна вышэй, чым сказана ў кампліменце.

4. «БЕЗ ПРЭТЭНЗІЙ». Суразмоўца зусім не імкнецца да ўдасканалення данай сваёй якасці. Больш таго, лічыць, што было б дрэнна, калі б яна — гэтая станоўчая якасць — была выражана ў яго больш моцна, чым ёсць. Робячы кампліменты, не парушайце правіла «без прэтэнзій».

5. «БЕЗ ДЫДАКТЫКІ». Гэта правіла заключаецца ў тым, што кампілімент павінен канстатаваць, г. зн. сцвярджаць наяўнасць данай характарыстыкі, а не змяшчаць рэкамендацыі па яе паляпшэнню.

6. «БЕЗ ПРЫПРАЎ». Апошняе правіла датычыцца не самога зместу кампліманта, а тых дадаткаў, якія нярэдка ідуць за ім. Прыклад: «Рукі ў цябе сапраўды «залатыя». А вось язык твой — вораг твой!» Ці: «Мне вельмі імпануе ваша здольнасць выклікаць у людзей прыхільнасць да сябе. Толькі вось калі б гэтую здольнасць — ды ў інтарэсах справы...» Такім чынам, робячы кампілімент, устрымайцеся ад лыжкі дзёгцю.

Дапаможам тым, хто пачынае. Для тых, хто ўсведамляе сваё няўменне рабіць кампліменты і адначасова разумее (і... прымае) неабходнасць авалодання гэтым прыёмам, мы прывядзём некалькі прыкладаў кампліментаў.

Субяседніку — пра яго асобасныя якасці:

1. Калі ён змог некага ўгаварыць зрабіць тое, што не ўваходзіла ў яго абавязкі: «Як вам удаецца так выклікаць у людзей прыхільнасць?»

2. У адказ на добрую ўсмешку, відавочна адрасаваную вам: «Ці ведаеце вы, што ваша ўсмешка проста абяззбройвае людзей!»

3. Пасля працяглых перагавораў, якія скончыліся для вас удала: «Заўсёды б мець такога прыемнага партнёра (субяседніка)!»

4. Калі гутарка скончылася з поспехам: «Як жа прыемна пагутарыць з вамі!»

5. Чалавеку, які нечакана для вас адкрыў вам на нешта вочы: «Размаўляючы з вамі, можна шмат чаму навучыцца!»

6. Чалавеку, які расказаў вам нешта новае пра К., якога вы раней добра ведалі: «У вас надзвычайная назіральнасць!»

7. Чалавеку, які нечакана для ўсіх бліснуў сваёй эрудыцыяй: «Мяне заўсёды здзіўляе шырыня вашага кругагляду!»

8. Чалавеку, які з простых рэчаў зрабіў нешта прыгожае, прывабнае: «У вас цудоўная здольнасць бачыць прыгожае там, дзе іншыя не здагадаліся б!»

9. Чалавеку, які быў удзельнікам канфлікта з кім-небудзь і ўстрымаўся ад выпаду ў адказ: «Як вы здолелі выхаваць у сабе такую стрыманасць?!»

10. Чалавеку, які ўсё ж такі дасягнуў свайго: «Гэта цудоўна, што ў вас такі настойлівы характар!»

11. Чалавеку, у якога новы, няяркі касцюм: «Як вам удаецца вытрымліваць моду і сціпласць адначасова?!»


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

10 студзеня

Зак. 2052.

Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.